3. Pamiętniki Krisztafa Zawiszy, wojewody Mińskiego. Warszawa, 1862.
4. Niemcewicz J. Pamiętniki czasow moich. Tarnow. 1880.
5. Zajączkowski A. Glowne elementy kultury szlacheckiej. Wroclaw, 1961.
6. Witwinska M. Kuligiem przez trzy stulecia. Warszawa, 1961.
7. Дмитриев М. В. Польская шляхта в 16—18 вв. // Европейское дворянство 16—18 вв. : границы сословия. М., 1997.

***Ю. Ю. Захарына***
*г. Мінск*

## НАРОДНЫЯ МАТЫВЫ Ў СУЧАСНАЙ АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ (1980—1990-я гг.)

Пошукі шляхоў выкарыстання лепшых традыцый — гэта адметная прыкмета нацыянальнага дойлідства, у аснове якой заўсёды ляжаў прынцып пераемнасці ўнутраных істотных рыс архітэктуры, сугучных сучаснасці [1]. Наватарства з'яўляецца вынікам творчага засваення народных і прафесійных традыцый.

У беларускім дойлідстве ў апошні час яскрава выяўляецца глыбіня нацыянальных асаблівасцей мастацтва. Аднак выкарыстанне традыцыйных формаў — гэта зусім не абавязковая даніна архаіцы, а, па сутнасці, спроба супрацьстаўлення канструктывізму, функцыяналізму, новага накірунку ў нацыянальным мастацтве.

Ужо ў 80-я гг. 20 ст. у мастацтве Беларусі назіраецца тэндэнцыя да арганічнага спалучэння традыцыйнага і новага. Творы гэтага перыяду адрозніваюцца разнастайнасцю і глыбінёй творчых пошукаў, імкненнем пашырыць звыклыя межы сродкамі мастацкай выразнасці. Па-новаму ўспрымаюцца традыцыі мінулага, глыбей асэнсоўваецца сучаснасць. Асабліва інтэнсіўна гэты працэс ідзе ў канцы 80—90-х гг., што звязана з актывізацыяй руху за нацыянальна-культурнае адраджэнне.

Сучасная архітэктура Беларусі ў межах постсавецкай прасторы існуе як працяг і адначасова адмаўленне яе традыцый. У выніку зняцця "ідэалагічнага вета" на стыль, пануючага ў савецкія часы, галоўным адрозненнем беларускай архітэктуры 80—90-х гг., што зведала ўплыў постмадэрнізму, стала "імкненне працаваць у стылях" [2]. Архітэктура гэтага часу набыла рысы рэтраспектыўнасці. Стылістычная неакрэсленасць нясе на сабе адбітак грамадскай ментальнасці, сфарміраванай савецкай культурай. Пры гэтым у стылістычных адносінах існуе пэўнае жанравае размежаванне

у архітэктуры офісаў і масавага жылля захаваў свае пазіцыі мадэрнізм. Праявы постмадэрнізму часцей знаходзім у грамадзянскай архітэктуры, культавым дойлідстве і індывідуальным жыллёвым будаўніцтве.

Агульнай тэндэнцыяй, што яскрава вылучаецца ў грамадзянскай архітэктуры Беларусі 80-х гг. 20 ст., з'яўляецца імкненне адысці ад тыпізацыі і надаць пабудовам індывідуальныя, своеасаблівыя рысы, мастацкую выразнасць. З сярэдзіны 80-х гг. 20 ст. у Мінску пракладваецца лінія метро, архітэктуры якога ўласцівы лаканізм, стрыманасць у выкарыстанні мастацкіх сродкаў і разам з тым дастатковая выразнасць, адпаведнасць тэматыцы архітэктурна-мастацкага вырашэння месцам размяшчэння станцый. У адносінах да мінскага метрапалітэна можна сказаць, што тут выяўляецца апраўданае лінейнае вырашэнне канфігурацыі [3]. Архітэктурна-планіровачнае вырашэнне ядра і зоны ў пешаходнай даступнасці станцый вызначалася наяўнасцю і шырынёй транспартнага калідора, у якім дзейнічае метрапалітэн, размяшчэннем трасы хуткаснага транспарту і станцый па лініі руху. Звяртае на сябе ўвагу культура архітэктурных дэталей, якія нясуць на сабе і класічныя, і сучасныя рысы [4]. Аздабленне і архітэктура станцый метро вызначаюцца двума прынцыпамі канструкцыйнага вырашэння: рамна-бэлечнага (станцыі "Акадэмія навук", "Плошча Якуба Коласа", "Плошча Перамогі", "Кастрычніцкая") і скляпеністага (станцыі "Парк Чалюскінцаў", "Плошча Незалежнасці", "Інстытут культуры" і інш.) [5].

Лінія першай чаргі Мінскага метрапалітэна ўключае 9 станцый. Выразным архітэктурным вырашэннем адзначаецца станцыя "Плошча Якуба Коласа" (архітэктары М. Пірагоў, А. Зянзін, К. Філіповіч; мастакі Г. Жарын, Ю. Багушэвіч), інтэр'ер якой выкананы ў нацыянальных традыцыях з выкарыстаннем дэкаратыўных керамічных пано з адлюстраваннем народных матываў (танцы, касцюмы) і упрыгожаннем апорных слупоў традыцыйным арнаментам. Яскравая, выразная архітэктура платформеннай залы працягвае асноўную тэму самой плошчы, на якой узведзены манумент народнаму паэту. У дэкаратыўным аздабленні калон прысутнічаюць матывы яго творчасці.

Сярод грамадскіх будынкаў, прызначаных для адпачынку, вылучаецца праект карчмы ў "Дудутках", распрацаваны архітэктарамі А. Базевічам і С. Сергачовым. Па плане карчма ўяўляе сабой комплекс будынкаў, якія пры блакіроўцы ўтвараюць прамавугольнік

з дыяганальным выступам. Архітэктурна-прасторавая кампазіцыя карчмы заснавана на прынцыпе замкнёнага двара са скразным праездам і добрай арганізацыяй унутранага дворыка. У цэнтры плануецца ўзвесці сонечны гадзіннік з драўлянымі скульптурнымі выявамі язычніцкіх багоў. Сам двор стане месцам культурна-масавага адпачынку, дзе будзе збірацца моладзь на буйныя традыцыйныя беларускія святы, накшталт Калядаў, Масленіцы, Купалля.

Музей-карчма ў "Дудутках" будзе мець пэўныя адрозненні ад гістарычных пабудоў беларускіх корчмаў. Аўтары праекта імкнуцца атрымаць як у знешнім аблічы пабудоў, так і ў інтэр'еры новае гучанне. Аднак нярэдка ў канструкцыі побач з новымі элементамі можна сустрэць і рэтраспектыўныя рысы беларускай архітэктуры. Цікавай задумай у гэтым сэнсе з'яўляецца манументальна-мастацкае вырашэнне фасадаў. Крывалінейныя франтоны з рысамі барока гарманічна спалучаюцца з двухсхільным дахам. Хочацца падкрэсліць, што адным з адметных элементаў знешняга аблічча музея-карчмы ў "Дудутках" з'яўляюцца шматлікія вокны рознай формы і велічыні, што характэрна для традыцый будаўніцтва корчмаў у 16—19 стст. Унесеныя ў аздабленне пабудовы рэтра-элементы, звязаныя з вобразным адлюстраваннем тэмы, узбагачаюць планіроўку комплексу. І менавіта такое вырашэнне музея-карчмы ў "Дудутках" дазваляе ў пераасэнсаваным выглядзе адрадзіць традыцыі беларускага народнага дойлідства [6].

Вырашэнне праектаў жылых дамоў у межах пэўных творчых майстэрняў архітэктараў мае свае асаблівасці. Адны архітэктары схіляюцца да класічных прынцыпаў будовы аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, іншыя праекты ўвасабляюць рысы народнага дойлідства.

Шырокае распаўсюджанне ў дзейнасці творчых майстэрняў архітэктараў атрымалі праекты індывідуальных жылых дамоў катэджнага тыпу, дзе менавіта і знайшлі адлюстраванне народныя матывы дойлідства. Цікавае вырашэнне набыў праект індывідуальнага чатырохкомнатнага жылога дома ў Брэсце, рэалізаваны ў канцы 90-х гг. (архітэктар В. Кескевіч). Складаная архітэктурна-прасторавая кампазіцыя будуецца на кампаноўцы аб'ёмаў пад розным вуглом (перпендыкулярна і дыяганальна). Асноўны аб'ём мае двухсхільнае завяршэнне даху. Гэты ж прыём паўтараецца ў мансардных надбудовах іншых аб'ёмаў. Для пакрыцця даху выкарыстоўваецца распаўсюджаны ў гэты час матэрыял — металачарапіца. Пры сучасным

канструкцыйным вырашэнні ў архітэктурна-мастацкай кампазіцыі знайшлі адбітак розныя стылістычныя рысы, якія праглядаюцца ў асобных архітэктурных элементах. Напрыклад, у агульнай кампазіцыі будынка выкарыстоўваюцца вокны featured формы (прамавугольныя і з паўцыркульным завяршэннем), сам прынцып блакіроўкі аб'ёмаў прасякнуты рысамі постмадэрнізму. Пры ўсім багацці прынцыпаў і прыёмаў мастацка-эстэтычнай арганізацыі збудаванне не мае прататыпаў ці аналагаў.

Напластаванне розных стылістычных накірункаў добра відаць на прыкладзе жылога дома № 3 па вул. Леваноўскага ў Брэсце (архітэктар А. Янушка), які ў выніку правядзення рэстаўрацыі і рэканструкцыі (навуковы кіраўнік С. Алясевіч) атрымаў сучасны выгляд. Кампазіцыя яго ўяўляе сабой прамавугольнік. У абліччы пабудовы дакладна праглядаецца геаметрычнасць, структурнасць, якая будуецца па прынцыпах сіметрыі, што ў большай ступені характэрна для класіцызму з уласцівай яму строгасцю і прапарцыянальнасцю. Два сіметрычна размешчаныя ўваходы ў вуглавых частках будынка маюць арачную канструкцыю. Высокі двухсхільны дах, які выкарыстоўваецца ў вырашэнні кампазіцыі, больш уласцівы народнаму дойлідству. Металічная рашотка агароджы з пакладзеным у мастацкую задуму матывам раслінных завіткоў адлюстроўвае рысы мадэрну. Аднак, пры ўсёй разнастайнасці архітэктурна-канструкцыйных элементаў пабудове ўласціва агульнасць вобразнага вырашэння.

Рэтраспектыўная тэндэнцыя дастаткова выразна адбілася і ў праектах індывідуальных жылых дамоў і будынкаў катэджнага тыпу. Вывучаючы і пераасэнсоўваючы лепшыя сусветныя дасягненні эпох, архітэктары ствараюць унікальныя праекты. Прыкладам у гэтым сэнсе можа служыць жылы дом у п. Міжрэчча Віцебскай вобл., праект якога распрацаваны інстытутам "БелНДІгіпрасельбуд" (архітэктары Л. Нордштэйн, А. Белавусаў). Выкананы з традыцыйнага для Беларусі будаўнічага матэрыялу — цэглы, што дазваляе атрымаць самую разнастайную канфігурацыю аб'ёмна-прасторавай будовы і ўзбагаціць пабудову ствараемымі дэкаратыўнымі элементамі і дэталямі. На ўсіх чатырох фасадах ствараюцца дэкаратыўныя элементы, якія падкрэсліваюць вертыкаль. Магутны гранёны рызаліт на адным з фасадаў перакрыты казырком. Цікавае вырашэнне атрымаў дах, маючы ламаную канфігурацыю.

Жыллёвая архітэктура 90-х гг. 20 ст. адзначаецца хуткімі тэмпамі будаўніцтва малапавярховых, катэджных дамоў, хаця ідэя

пераходу да індывідуальнага жылля не з'яўляецца прынцыпова новай [7]. Практыка ўзвядзення катэджаў атрымала распаўсюджанне ўжо ў 50-х гг. 20 ст. На той час у Мінску і іншых буйных гарадах Беларусі катэджамі пачалі забудоўваць цэлыя кварталы (напрыклад, вул. Фрунзе і Захарава ў Мінску). Аднак экстэр'ер такіх будынкаў быў аднатыпным і не вылучаўся высокай мастацкай каштоўнасцю. У асноўным — гэта мураваныя двухпавярховыя дамы.

Зараз будаўніцтва катэджаў вядзецца, пераважна, на прыгарадных тэрыторыях. Нельга не адзначыць шырокага пранікнення рэтраспектыўнай стылістыкі ў гэтую галіну жыллёвага будаўніцтва. Выкарыстанне ў такіх пабудовах гістарычных элементаў дойлідства становіцца сёння звычайнай з'явай. Нярэдка можна ўбачыць катэджы, у канструкцыі якіх ужываюцца вуглавыя вежы, зубчатыя завяршэнні сцен, невялічкія паўцыркульныя аконныя праёмы (Баравая, Бараўляны, Гарадзішча Мінскага р-на). Выразныя кампазіцыйныя будовы аб'ёмна-прасторавай арганізацыі часам маюць у аснове класіцысцкія матывы.

Шэраг цікавых праектаў катэджаў прапануе творчая майстэрня архітэктара А. Корбута. Усе яны маюць у аснове розныя прынцыпы аб'ёмна-прасторавай будовы, адрознівае іх вырашэнне экстэр'ера. Гэта даволі простыя ў плане геаметрычныя збудаванні і будынкі, у аснове якіх ляжыць ідэя блакіроўкі аб'ёмаў разнастайнай планавай будовы і вышыні. Яны могуць мець высокі цокаль, вальмавы ці двухсхільны дах, у канструкцыі ўжываюцца рызаліты, аркі, мезаніны, разнастайныя як мастацкія, так і тэхнічныя вырашэнні аконных праёмаў. Часам як архітэктурна-канструкцыйны элемент ужываецца вежавая форма. І нават пры наяўнасці аднолькавых архітэктурных элементаў кожны з іх мае сваё мастацка-эстэтычнае аблічча.

Некалькі цікавых прыкладаў архітэктурна-мастацкага вырашэння катэджаў прадставіў інстытут "Гомельпраект". Прыцягвае ўвагу праект катэджа з буса (архітэктар Г. Ціхаў). Агульны прынцып аб'ёмна-прасторавай арганізацыі, сам матэрыял пабудовы, прыём злучэння сцен (з астаткам) маюць адпаведнасць з традыцыямі ўзвядзення народнага жылля. Пры гэтым дэкаратыўна-эстэтычная выразнасць, якая дасягаецца дзякуючы ўжыванню сучасных форм і канструкцый пэўных архітэктурных дэталей, набывае яркі, запамінальны характар.

Яшчэ адзін прыклад вырашэння катэджаў прапанавалі архітэктары А. Стаянава, С. Маісеенка. У аснову праекта пакладзены

прынцып блакіроўкі аб'ёмаў. Па агульнай кампазіцыі група катэджаў уяўляе аб'ёмна-прасторавую арганізацыю, прасякнутую рысамі постмадэрнізму. Гэтую ж думку сцвярджае і наяўнасць высокай шматграннай вежы ў адным з катэджаў. Так, зусім розныя па архітэктурна-мастацкім вырашэнні праекты маюць агульную тэндэнцыю — выкарыстанне прынцыпаў і прыёмаў, распрацаваных папярэднімі стылямі і накірункамі.

Адметнай рысай сучаснай архітэктуры Беларусі з'явілася шырокае пранікненне рэтраспектыўнай стылістыкі. Зварот да гістарычных традыцый дойлідства спрыяў варыянтнасці аб'ёмна-прасторавых вырашэнняў кампазіцый будынкаў. У асобных выпадках гістарычныя элементы знайшлі адлюстраванне не толькі ў дэталях, але і ў агульным абліччы пабудовы, у архітэктурна-прасторавым вырашэнні.

Такая сітуацыя склалася з прычыны імкнення архітэктараў да стварэння непаўторных пабудоў, знешні выгляд якіх цалкам адказваў бы патрабаванням грамадства. Знешняе аблічча пабудоў у многім вырашае праблему эстэтычнага задавальнення. А рэтра-элементы, якія ўжываюцца пры ўзвядзенні будынкаў, спрыяюць дасягненню пэўнага эмацыянальнага гучання. Кожны такі будынак мае індывідуальнае вырашэнне. Але ўсё ж такі існуюць характэрныя рысы, уласцівыя большасці пабудоў: па-першае, гэта імкненне да замкнутай структуры з унутраным дворыкам; па-другое,— захапленне вежавымі формамі.

У 80—90-х гг. 20 ст. рэтра-элементы пачалі выкарыстоўвацца ў дойлідстве розных тыпаў аб'ёмных збудаванняў: грамадскіх і жылых будынках, катэджным будаўніцтве. Характэрным стала і адмаўленне ў многіх выпадках ад пэўных тэхналагічных навацый і арыентацыя на традыцыйныя будаўнічыя матэрыялы і метады. Нацыянальныя рысы беларускага дойлідства адбіліся на вырашэнні аб'ёмна-прасторавых кампазіцый будынкаў, маючых мансардныя надбудовы, двухсхільныя дахі, а таксама на аздабленні фасадаў, у тынкоўцы якіх нярэдка спалучаюцца белы і чырвоны колеры. Так узаемадзеянне гістарычнага і новага ў сучасных пабудовах паспрыяла стварэнню выразных мастацка-эстэтычных вырашэнняў будуемых аб'ектаў.

---

1. Беккер А. Ю., Щенков А. С. Современная городская среда и архитектурное наследие ЦНИИ теории и архитектуры. М., 1986. С. 85—86.

2. Ребайн Т. Я. Ассимиляция постсоветских тенденций в столичной и провинциальной архитектуре 80-х гг. // Российская архитектурно-строительная

энциклопедия: В 4 т. Т. 4. Архитектура, градостроительство, здания и соору-ния. Специальное строительство / Под ред. Е. В. Басина. М., 1996. С. 38.
3. Кудрявцев О. К. Расселение и планировочная структура крупных го-дов-агломераций. М., 1985. С. 43.
4. Градостроительство Белоруссии / В. И. Аникин, Е. Л. Заславск И. А. Иодо и др.; Под ред. А. В. Сычевой. Мн., 1988. С. 81.
5. Лакотка А. І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мн., 199 С. 350.
6. Захарына Ю. Традыцыйныя беларускія корчмы // Мастацтва. 2000. № С. 45.
7. Федорова Н. Ю. Строительство коттеджей в Московском регио // Проект. 1993. № 1. С. 19.

*І. А. Шве*
*г. Брэс*

# ІДЭАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ РАСЛІННАЙ СІМВОЛІКІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Як вядома, фальклорныя сімвалы сведчаць пра стыхійн матэрыялістычныя ўяўленні народа, пра глыбокія назіранні за С светам, за навакollем. Узнікненне сімвалаў звязана з міфалагічна мадэллю свету, пабудаванай у выніку ўзаемадзеяння чалавека з пры родай і прадстаўленай шляхам перакадзіроўкі першасных (пачу цёвых) даных пры дапамозе знакавых сістэм. Выбар сімвалаў дл структурыравання Сусвету і апісання механізма яго функцыянава ня быў абумоўлены калектыўнымі ведамі пра свет. Ні адно з сема тычных увасабленняў для міфапаэтычнай свядомасці не з'яўляец абсалютна незалежным, "бо ўсе яны скаардынаваны паміж сабой утвараюць адзіную універсальную сістэму, якой яны і падпарадкав ны" [1]. Спасцігаючы Сусвет, старажытны чалавек расчляняў яг непарыўнасць шляхам бінарнага кантраставання. Першапачатко вымі *цаглінкамі* міфалагічных сімвалічных класіфікацый з'яўлян ца не матывы, а адносіны ў выглядзе элементарных семантычны апазіцый, у першую чаргу тых, што адпавядаюць простай пр сторавай і пачуццёвай арыентацыі чалавека. Такія адносіны поты *аб'ектывуюцца* і дапаўняюцца найпрацейшымі суадносінамі ў ка мічным прасторава-часавым кантыніуме, у соцыуме, або на мяж соцыуму і космасу, прыроды і культуры, непасрэдна да больш абс рактных лічбавых супрацьпастаўленняў і такіх фундаментальны антынонімаў, як жыццё-смерць, шчасце-няшчасце, а таксам